**Алена Пісарэнка**

**Дацэнт кафедры беларускай філалогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў**

# Гімн кнізе, слову і бібліятэкару



Над намі слова valадарыць…
*С. Грахоўскі*

У час інфармацыйных інавацый чым можна здзівіць?.. Усё камп'ютарызавана, усё тэхнізавана… Чалавек стварыў вялікую колькасць самых разнастайных машын і значна палепшыў сваю працу: машына лічыць, машына мые, машына нясе лісты у дом, машына спрабуе замяніць кнігу… Аднак ёсць тонкія рэчы, якія ідуць з душы, а можа, з космасу праз душу, ды яшчэ і не праз кожную душу. Толькі праз самыя вытанчаныя душы ідзе з нябёсаў музыка, жывапіс, паэзія…

Вечар, які сабраў пад свае крыло юных паэтаў і паэтак, ішоў пад ветразем радкоў С. Грахоўскага «Над намі слова валадарыць…» і пад святлом душы Любові Даніленкі. З году ў год яе творчыя дзеці, калегі-студэнты ФІДК, дарылі ёй свае вершы, а яна шчыравала – натхняла іх інфармацыяй ды сваім прыгожым вершаваным радком.

Утульная зала сабрала цікавых і цікаўных… Думаю, усім хацелася хутчэй пачуць, якія ж яны – *«тэхнічнага прагрэсу дзеці»* (Г. Бураўкін). Прыгажунькі-вядоўцы абвясцілі, што вечар паэзіі пачаўся, і яго Вялікасць Слова загучала. Некалі, калі яшчэ не было тэстаў, гэтай рамачкі для розуму і для творчасці, абітурыенты ФІДК пісалі доўгія, цудоўныя сачыненні. Ужо з самага пачатку бачылася і верылася: гэтыя дзеці данясуць інфармацыю і да розуму, і да душы чытача, яны будуць высока трымаць гонар кнігі. Прайшоў час, а слова, укладзенае ў тэкст, усё роўна творча ўзыходзіць, прабіваецца і расце, расце…

Першая частка вечара прысвячалася любові да прафесіі, абранай справы. Сапраўдны творца заўсёды ў працы знаходзіць паэзію, таму лёгка верыцца, напрыклад, Крахмалюк Кацярыне, якая запэўнівае, што бібліяграфія – яе жыццё, якая з ранняга дзяцінства ідзе з ёю адной сцягою. Гузавец Дзіяна стварае найдзівоснейшыя вершы, поўныя захаплення кнігай і Кніжным храмам (Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі), дзе бібліятэкар – магістар, навігатар, кароль. На жаль, не чытаў свайго верша Аляксей Кавалеўскі, але яго бездакорныя радкі пра інфармацыю вартыя цытавання: *Устало вздохнув, В библиотеку войдя, Наконец я увидел, Где обитает то, что ни потрогать, ни услышать, ни взять силой нельзя.*

***

У сталіцы маёй сінявокай краіны
Сярод маляўнічых дамоў і мясцін
Узвышаецца неардынарны будынак…
Як ружа сярод звычайных раслін.

Кожны тут знойдзе ўсё, што патрэбна –
Заказ вельмі лёгка і проста зрабіць,
А з фондасховішча па тэлеліфце
Праз пару хвілін кніга зможа прыбыць.

Тут знойдзеш усё, што душа пажадае,
Не толькі вучыцца прыходзяць сюды,
Час вольны касета, дыскета займае,
А хочаш – часопіс, пласцінка ці дыск.

Уладкаваўшыся ў крэсле утульным,
Паслухаеш музыку, фільм паглядзіш.
Не трэба спяшацца – цябе пачакаюць,
Будынак працуе і па выхадных.

Настаўнік і вучань тут веды шукае,
Студэнт, інжынер, музыкант, атлетыст.
Усім навукоўцам дапамагае,
А бібліятэкам яна метадыст.

Любы дакумент на вякі захаваюць,
Усе кніжныя скарбы ў алмазе збяруць.
А тых, хто каштоўнасць абараняе,
Бібліятэкарамі завуць.

*Дзіяна ГУЗАВЕЦ*

Цікава тое, што маладое пакаленне, а будучыня за ім, так светла і разумна гаворыць (пакуль у кантэксце сваёй працы): веды і ўменні – першасныя, але сутнасць (моладзь шукае сутнасць!) – у чалавеку, чалавечых адносінах. А ўбачыць чалавека, адчуць і задаволіць яго патрэбы, сістэматызаваць яго інфармацыйны свет

зможа толькі прафесіянал – той, хто выконвае працу *з душой*! (так лічыць Вольга Сінькова). Студэнцкае брацтва лічыць, што рознабаковасць асобы бібліятэкара фарміруецца тут, на ФІДК, дзе *ведаў Космас* (думаецца, у гэтай метафары гучыць удзячнасць тым, хто шчыруе не толькі на кніжнай ніве); метафара ад Вольгі Русак – і гэтай дзяўчыне зноў хочацца апладзіраваць.

Новік Антон, які піша і чытае рэп, экс-містар-стыль факультэта, раптам і нераптам паўстае ў новым амплуа: ён чытае свой верш, поўны сэнсаў і падтэкстаў пра тое, што *без мінулага няма будучыні*, што вельмі важна *не трапіць у павуціну* (відавочна, шматзначнай

* * *

Восхвалять – будто писать на заказ.
Знать истинный смысл, не это ли ценность для нас?
Два берега: потребитель и документ,
Кто посередине? КТО осуществляет обмен?

«Библио» – книга, «Графо» – пишу,
Библиография, как парашют:
Раскроется, если знать, где кольцо.
Сможешь собрать? Прогресс налицо!

Без прошлого нет будущего, так?
Ретроспективные указатели – левого крыла взмах.
Нас манят просторы! Где правое крыло?
Указатели текущие, и мы над землей высоко!

Не попадись в паутину. Пройдись по сети,
Машина наперед просчитает ходы.
Формируя запрос по ключевым словам,
Получишь тысячу ссылок по необходимым темам.

Зеркало судеб, вот оно, прикоснись,
В нем ты увидишь настоящую жизнь.
Как птице парить, проливая свет,
Но, до этого нужно дойти или долететь,

По четырём сторонам света, как видам поиска.
Впишешь ли свое имя в историю?
Я не Данилов, не Масанов, и далеко до Богданова,
Но в нас верит Любовь Ивановна. И это главное!

*Антон НОВИК*

метафарай паэт гаворыць не толькі пра сетку Інтэрнэту, але і пра жыццёвыя дарогі. І як важна ім, маладым, каб у іх верылі!) *А Любоў Іванаўна верыць!* Яна сапраўды верыць, а інакш такога цудоўнага вечара не адбылося б. І педагог бярэ слова, працягвае тэму прафесіі. Любоў Іванаўна, канечне, мае рацыю, калі гаворыць, што натхненне працаваць прыгожа мы пазычаем у *айчыннае зямлі*, там, дзе *летуценніцы чароўнай ночы – лілеі белыя ў балотцы, дзе сапоўка, стрыж і горліца…* І сама родная зямля – крыніца даследавання; пакуль цвіце, заклікае аўтар, рабіце *фота, відэа ці мультымедыа*.

*Без мінулага няма будучыні…* Гэта той масток, па якім сцэнарый вечара ідзе наперад, але тэматычна вяртае нас у мінулае. Будучыня ствараецца не толькі прафесіяналізмам асобы, але і грамадскім асэнсаваннем мінулага.Тэмы Вялікай Айчыннай вайны і Чарнобыля актуальна гучаць у самым пачатку мая, па-новаму і ў той жа час па-старому асэнсоўваюцца моладдзю. Свае вершы чыталі Ю. Коўшык, Л. Даніленка; прагучалі таксама вершы ветэрана вайны А.Г. Карташовай «Женский полк», «Идут на парад ветераны». Такі моцны выхаваўчы момант адчуваўся пры гэтай паэтычнай сустрэчы трох пакаленняў. І калі *«рукаюцца душы»* (Р. Барадулін), ёсць гармонія ў адносінах, у светаўспрыманні, а ў гармоніі, як вядома, – дасканаласць. Яна, дасканаласць, павінна стаць той пуцяводнай зоркай, якая не стане праз гады чарнобыльскай, горкай, палыновай… Наадварот, яна павінна вывесці нас у свет разумення, прыгажосці і ўзаемападтрымкі.

А сёння спагаду і падтрымку мы шукаем у мамы (*«Дні без Мамы – Яны не твае…»* – Р. Барадулін), *на родных сцежках з начным высокім небам раімся* (Г. Бураўкін ). Тэмы прыроды і маці ў вершах студэнтаў ФІДК сугучныя, бо ўсё існуе ў адзінстве, усё правамерна атаясамляецца: малая радзіма, бацькоўская хата, мама… Зноў падзяліліся сваімі паэтычнымі знаходкамі Л. Коўшык, Н. Бартноўская, Л. Даніленка. Л. Коўшык у сваім вершы шчыра прызнаецца, што не разумела маму, не адчувала, як той цяжка гадаваць дзіця… Шкада, што мацярынскі клопат не зразумелы дзецям, здаецца надакучлівым і непатрэбным… Добра, што ўсё ж, хоць і з цягам часу, дзеці разумеюць кошт гэтага клопату. Аўтарка рада: прыйшло і да яе ўсведамленне (*без матулі цяжка*), праўда, *«у маці папаўзла па косах сівізна»*, але, дзякуй Богу, ёсць яшчэ каму сказаць пяшчотнае слова матулька. Н. Бартноўская здзівіла мяне сваёй дарослацю у асэнсаванні кошту мацярынскага клопату; яна ўжо ведае: каб зладзіць-сплесці лёс дзіця, трэба не адна нітка, а для гэтага трэба *расплесці нітку* свайго жыцця. Л. Даніленка сваім вершам нібы падагульняе: важна мець у жыцці такое шчасце – шчасце мець бацькоў. Здаецца, што гэта мала, насамрэч гэта шмат, гэта цудоўна, калі ёсць да каго прытуліцца… калі ў роднай хаце цябе чакаюць-сустракаюць…

**Мама**

*Калі ў люстэрка стала заглядацца,*
*Заныла сэрца ад хлапечага імя*
*Бы той лісток ад дрэва, адхіляцца*
*Я ад цябе, матуля, пачала.*

*Стаяць з табою сорамна было мне,*
*Тым больш, пры ўсіх матуляй называць.*
*Я слова МАЦІ быццам бы забыла,*
*Цябе я перастала заўважаць.*

*Не спала ты даўжэзнымі начамі,*
*Ад слёз гарэла полымем шчака.*
*Глядзела ў цемру мокрымі вачамі –*
*Ці з дыскатэкі йдзе яе дачка?*

*Парой асенняй адпачынку ты не знала,*
*Зусім не памагала я табе.*
*На суд людскі ты мякка адказала:*
*"Яна яшчэ маленькая ў мяне".*

*І зноў сама хадзіла ты па дровы,*
*Сама нясла свінням ты гарбуза.*
*І нават не заўважыла пра тое,*
*Што папаўзла па косах сівізна…*

*Ідуць гады… Сама я пасталела*
*І зразумела – цяжка аднаму!*
*Тады сказаць МАТУЛЬКА я не смела,*
*Цяпер кажу – бо ёсць яшчэ каму…*

*Людміла Коўшык*

***

Камусьці будуць сніцца сёння верацёнцы
І ніці сонца,
З якіх узор жыцця ітчэцца
На прабабулiных яшчэ красёнцах.

А мне – як я лілеі белыя збіраю
на Палессі
у балотцы…

Але руку маю
спыняе хтосьці:
Не рві!
Яны
для вечнае тут прыгажосці.

*Любоў ДАНІЛЕНКА*

Паэтычная старонка аб роднай прыродзе таксама не пакінула аўдыторыю раўнадушнай, бо хіба ж не могуць узяць у палон радкі, напрыклад, Аляксандра Лукшыца (цяпер ужо былога студэнта ФІДК): *Те места мной ничуть не забыты: С детских лет в чистом сердце храню Нежный образ печальной ракиты И кудрявых берез седину*. У любові да родных мясцін прызнаюцца і Л. Даніленка, Д. Ажгірэвіч, І. Бельская (ФЗН). Кожны з аўтараў пакпаніўся таму промню, які стаў для яго крыніцай натхнення: Любоў Іванаўна – палескім лілеям, Дзмітрый – хлебнаму коласу, Вольга – сваёй сяброўцы, восені-вандроўніцы.

Захапленне родным домам, краем выходзіць на шырокі прастор. Тут, у родным доме, павінна гучаць родная мова: творчая моладзь усведамляе сябе беларусамі, а як інакай? Яны ж студэнты БДУ культуры і мастацтваў: а якая беларуская культура без беларускай мовы! Сэнс вершаў гэтай часткі вечара пабагушэвічаўску простыі складаны: *не пакідайце, каб не ўмёрлі*. Маладое пакаленне не хоча, каб *мова аджыла век свой ціхі* (П. Панчанка). Безумоўна, мілагучнасць роднай мовы чуецца ва ўсім: у словах *бульба, хата, бабуля* (К. Крыкала, ФКІСКД), у гуку Ў (Л. Даніленка).

***

Не прамяняю «у кароткае»
Я ні на «ігрык», ні на «джэй».
Няхай яно падводнай лодкаю
Прастору мовы сцеражэ.

Можа, спазнаю іерогліфы,
Магчыма, вывучу іўрыт,
Але з кірыліцай Мяфодзія
Душа спявае і баліць.

Мы з роднай мовай – ад калыскі
Да развітальных нашых дзён.
А на «сусветнай» – крык свой першы
Здзяйсняем
і апошні стогн.

*Любоў ДАНІЛЕНКА*

Адно са слоў, якое намі валадарыць, што нам адкрывае свет ці часам хавае святло, адно са слоў, што акрыляе ці пакутна раніць, адно са слоў, якое называе магічнае пачуццё, – каханне… У гэтай аднайменнай рубрыцы госці вечара пачулі трапяткія вершы В. Русак, В. Скачок і песню А. Кулішэнкі. І няхай у радках дзяўчат быў сум, бо не спраўдзіліся надзеі (так бывае), але не было адчаю. *«Ці зладжу я з сабой – не знаю»*, (Н. Гілевіч ) – так думае шмат хто з закаханых з розных прычын, але трэба зладзіць… І В. Скачок у сваіх паэтычных мроях ляціць *лечиться рассстояньем и лишь все краски осени* бярэ *в метели снеговые*… В. Русак, нягледзячы на няспраўджанае каханне, якое прайшло, как ураган, навучылася быць моцнай і не дазволіла нянавісці завалодаць яе сэрцам. А. Кулішэнка таксама высакародна прапаноўвае спыніць – *растворить боль, отпустить ее бумажным змеем*.

О, каб людзі не пускалі ў свае сэрцы нянавісць, зайздрасць, жорсткасць, свет бы зыначыўся, пацяплеў, расквітнеў… О, Божа, напраў нашыя душы на тыя сцежкі, бо ты ж, Уладар, даруеш *сілы* і *натхненне жыць*… (А. Багамолава). Напрыканцы вечара свой «Ліст да Бога» чытае Ю. Коўшык. Гэтае мілае дзіця з такім агромністым сэрцам хвалюецца за ўвесь белы свет, за гармонію існавання чалавека на зямлі: *Пусть наш мир наполняется светом, Добротой неземной, красотой! Я пишу тебе, Боже, об этом! Прочитай, я прошу, Боже мой!* І як адказ на трывогу дзяўчыны гучыць новы верш А. Новіка «Мне хочется верить…» Калі нашыя дзеці вераць, што ёсць справядлівасць на свеце, што *и на нас снизойдет благодать*, калі нашыя дзеці думаюць пра тое, каб бацькам за іх не было сорамна, мы – шчаслівыя бацькі і педагогі, і хто, калі не мы, падтрымае іх сёння. Нам таксама не павінна быць сорамна перад сваімі дзецьмі за раўнадушша, за тыя хуткасці гаворак і за казкі па тэлефоне, і за гульні ў камп'ютары. Трэба быць разам, як і было ўсё на паэтычным вечары ФІДК. Так, былі ж яшчэ госці – выкладчыкі В. Варапаева, Л. Дзямешка, выпускнік універсіэта А. Шостак, яны чыталі свае творы, яны дарылі маладым калегам кавалачак сваёй душы, праменьчыкі свайго цяпла. Вершы выкладчыкаў былі лёгкасумныя, узнёсла-напеўныя, у той час як А. Шостак падзяліўся сваімі незвычайнымі паэтычнымі знаходкамі *колеру індыга*. Слова-падзяку пачулі студэнты і арганізатар вечара Л. Даніленка ад дэкана факультэта ФІДК М.А. Яцэвіча.

Мне як філолагу з немалым стажам і вопытам хочацца запэўніць чытача, што слова, якое свяціла нам у той вечар, было шчырым (а гэта важна), дакладным і эстэтычным у філалагічным сэнсе. Вобразныя сродкі, створаныя моладдзю і іх настаўнікамі, варта ўзгадаць як у вузкім, так і ў шырокім кантэксце. Многія з тропаў (эпітэтаў, метафар, параўнанняў, перыфраз як найбольш прадуктыўных іх тыпаў) маюць індывідуальна-аўтарскі характар, што яшчэ раз падкрэслівае неардынарнасць светабачання творцаў, напрыклад,

**эпітэты** – гэта заўсёды лаканічныя вобразныя азначэнні, як правіла, аўтарскай разнавіднасці: горькое письмо, смешная луна, ночь безумная, глупая война (Ю. Коўшык), чувства буранные, чувства хмельные; думы, не истребимые годами (В. Скачок), нас много, не объяснимых наукой, гнусные мысли; сухие интриги; бесконечный горизонт (А. Новік); след Чернобыля полынный, ужасный; синеокая прекрасная Беларусь (А. Ставіцкая); блакітна-прамяністы позірк, жам-

чужная ўсмешка; (Л. Даніленка); восень-вандроўніца, восень-сяброўка (І. Вельская); медленный холод; тороплівая фея (А. Кулішэнка); бязмежная даль, светлыя высі, месячык-задзіра (В. Варапаева); услужливый ветер; ветер – шалун да проказник (А. Лукшыц); бясконцы свет цікавай кнігі; свет кнігі – маяк (Д. Гузавец); госпожа Библиография (О. Русак); горад колеру індыга, вечная дарога праз танэлі і масты, сухія кветкі на нямым люстэрку, гмах-мінарэт, глеба-дзяруга (А. Шостак);

**параўнанні** як троп, які выяўляе сутнасць прадмета праз супастаўленне, таксама найчасцей мае аўтарскі характар: седым вампиром выплыла луна; зеленые, как мох, глаза; Ангел быстрее вздоха взметнулся к Богу; скромность стала обузой; друг, как хищник, идет на друга; дружба стойкой сильнее скалы; наша земля запоет, как ребенок безгрешный; солдаты сильные, как пламя (Ю. Коўшык); облака клоками рваными (В. Скачок); вясёлка выгінаецца дугой; гукі чыстыя, бы росы на світанку (Л. Даніленка); И след Чернобыля прошелся, как кинжал по жизни и судьбе (А. Ставіцкая); і думы самотныя чародкаю коцяцца; каб лясочак быў, як рай (В. Варапаева); бы той лісток ад дрэва, я ад цябе, матуля, адхіляцца пачала (Л. Коўшык); отпустим упреки бумажным змеем и боль растворим так, как сумеем (А. Кулішэнка); я сегодня печальный, как лунный свет (А. Лукшыц); слова

**Есть в нежности плывущих облаков...**

Есть в нежности плывущих облаков
Своя волнующая прелесть,
Без измененья в чистом небе вновь
И на душе покой и свежесть.

Печальная и тихая лазурь
Устало дремлет над землею,
Познавшая немало горьких бурь,
Вступает в заговор со мною...

Александр ЛУКШИЦ

бібліятэкар магічнае, як алмаз; будынак неардынарны, як ружа сярод звычайных раслін (Д. Гузавец); библиография, как парашют; мне хочеться верить двадцать четыре часа в сутки, Как верят в двадцать четыре тональности в музыке; верю, как герой Бодрова, что сила в правде (А. Новік); адракліся ад мовы, як ад маці (К. Крыкала); а вочы горада – бы колеру індыга; туманы над каменнай горкай, бы смог над Шанхаем; я цалую твае сляды, бы адбіткі тваіх падарожжаў (А. Шостак);

**метафары** як іншасказальныя выразы заўсёды напоўнены арыгінальным зместам; яны найбольш дэманструюць неардынарнасць светаўспрымання, мыслення аўтараў: точечный взгляд науки (М. Семяняка); бездушный людской океан, лучик солнца щеки целует игриво; утро просыпается и петух поет шаловливо; сопят часы, от боли разрываясь; глаза экрана; разврат веселится; песня безжалостной войны; взрывались бомбы на груди войны (Ю. Коўшык); белая лілея ў ліст балотны горнецца; няхай яно (Ў) падводнай лодкаю прастору мовы сцеражэ; навальніцу ластаўкі прарочаць; дыхання цёплы парасон; дыхае ралля; ніці сонца (Л. Даніленка); стогны мовы; каб мова наша дзіця закалыхала (К. Крыкала); фея… тонкой иронией рвет на минуты время мое; рвет мою радость, рвет мое горе; не убежать коридором терпенья; крылья мои продырявлены спицей; утро растаяло; мы ведь посмеем подняться назад в облака по ступеням (А. Кулішэнка); мелодия души, воспоминаний чистая река, звезды плакали (В. Русак); тоска, улетай; печаль отступай; и если рушишь, сгорит и твое гнездо; лишая меня смысла, руша святое; смотри под ноги, там лики униженных; все замки из песка на морских берегах съедает вода (А. Новік); папаўзла па косах сівізна (Л. Коўшык); без запаха, без цвета, без окраски, Ползла, ползла опасность по земле; Смертельный воздух разносился ветром, Открыв дорогу разрушенью и беде (А. Ставіцкая); хвала той зямельцы, што колас хлебны капыхала; хай песня пра колас вашы сэрцы кране (Д. Ажгірэвіч); паплывеш ты, восень, на марах да хаты (І. Бельская); ночка зоркі запаліла; сэрцам к сэрцу прытуліся; месячык… схавай у хмарку носік; у шыбу галінкаю стукае снежань, маркотнаківае сівой галавой; аблачынка, нібы дзяўчынка, распусціла коскі (В. Варапаева); машут листвою каштаны; на вытяжку клены стоят на параде (А. Карташова); калі бярэш у рукі кнігу, з табою вечнасць размаўляе; і тут пакрыху ажываюць паэмы, хоку і санеты; патрапіць у папон да кнігі (Д. Гузавец); воздух слушать, образы собирать (А. Ковалевский); знаний Космос, социогуманитарный компас (В. Русак); два берега: потребитель и документ (А. Новик); шукаў сябе – згубіў мяне; і ўсё безнадзейней «заўтра», і ўсё настальгічней «было»; асколак надзеі капоціцца ў левым баку; знайсці б дзе апору для гэтай маркотнай пары (Л. Дзямешка); ламае вецер парасон; туманы над рэхам нашых сустрэчаў знікаюць; сцежка вузкая перасыхае; амаль апошні від з Чырвонай кнігі жыцця; а няўлоўныя цуда-сляды адлюстроўваюць нашае рэха… (А. Шостак);

**перыфразы**, створаныя паэтамі, – рэдкасныя вобразныя сродкі, але валодаюць высокай эстэтычнай вартасцю, бо маюць індывідуальны змест: бібліяграфія – маё жыццё (К. Крахмалюк); Трагедия ХХ-го столетья, Горчит она, полынь-трава (А. Ставіцкая); хлебны колас – аснова жыцця, горыч нашай зямлі, яе соль (Д. Ажгірэвіч); бібліятэкар – магістар вялікі, навігатар, зорка на шляху тваім, наватар, настаўнік твой і спадарожнік па жыцці (Д. Гузавец); герой других книг; жизнь – это поиск несбывшихся снов; всего один эпизод – и корабль на дне (А. Новік); і пасыпаліся дажджынкі – яе слёзкі (В. Варапаева); лілеі белыя ў балотцы – летуценніцы чароўнай ночы (Л. Даніленка); і горад твой – закінуты вандроўнік (А. Шостак).

*«Дзеці тэхнічнага прагрэсу»* і Любоў Іванаўна, нізкі Вам пакпон за чысціню і шчырасць, за вершы, за песні, за музыку… Я ведаю, што слова валадарыць… І веру, што кніга будзе жыць!

**Summary**

The readers are presented with the information on the poetry of the Belarusian State University of Culture and Arts students. The article also presents some poems written by young writers.